**У. А. Бобрык, А. А. Парукаў** (Беларусь, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны)

# МЯНУШКІ-ХАРАКТАРЫСТЫКІ ПСІХІЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ АСОБЫ Ў ГАВОРКАХ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Мянушкі як неафіцыйныя імѐны шырока ўжываюцца ў паўсядзѐнным жыцці вяскоўцаў і ўяўляюць сабой аб"ѐмны лексікасемантычны пласт лексікі. Адметнасць вулічнай мянушкі ў тым, што яна, выконваючы намінатыўную функцыю, указвае на аднаго чалавека, на ўласцівыя яму спецыфічныя рысы і не толькі называе асобу, але і трапна характарызуе яе, таму большасць мянушак носіць эмацыянальна-ацэначны характар.

Даследчыкі называюць наступныя асноўныя прычыны ўзнікнення мянушак: недастатковую колькасць афіцыйных асабовых назваў у параўнанні з патрэбамі камунікантаў: "ні адна мова (і беларуская не складае выключэння) не мае ў сваім звароце столькі асабовых імѐн, каб імі можна было без паўтарэння назваць усіх членаў таго ці іншага грамадскага калектыву" [2], імкненне да дакладнай персаніфікацыі пэўнай асобы, выдзяленне яе па якой-небудзь прыкмеце з пэўнага калектыву, асяроддзя"
[1, с. 118].

У якасці мянушкі практычна можа ўжывацца любое слова, вядомае вяскоўцам. У асноўным гэта агульнаўжывальныя літаратурныя лексемы, хаця шырокаўжывальнымі з"яўляюцца і дыялектныя.

Сабраны багаты фактычны матэрыял дазваляе вылучыць лексічнатэматычную групу вясковых мянушак, што характарызуюць псіхічныя якасці асобы. У мянушках падкрэсліваюцца наступныя характарыстыкі асобы:

**аматар сварыцца:** *Брытва* (в. Картынічы Лельч.), *Каза* (в. Карпаўка Лоеўск.), *Кіпяток* (в. Калыбаўка Жлоб.), *Крыса* (в. Ціхінічы Раг.), *Моська*
( в. Азяраны Раг.), *Скаварада* (в. Чорнае Рэч.); **веруючы**: *Багамол* (в. Кузьмінічы Добр.), *Варажэй* (в. Радуга Ветк.), *Ікона* (г. Лоеў), *Майсей* (в. Бяланавічы Петр.), *Святы* (в. Рудня Калінк.); **вучоны, шмат вучыцца, усѐ ведае:** *Мічурын* (в. Азершчына Рэч.),

*Радыѐ* (п. Красны Маяк Гом.), *Цілівізар* (в. Ястрабка Лоеўск.), *Газета* (в. Буда Люшаўская Б -Каш.), *Справачнік* (в. Маркавічы Гом.);

**вяртлявы, рухавы:** *Белка* (в. Вуглы Раг.), *Матыль* (в. Чкалава Гом.), *Мікроб* (в. Ціхінічы Раг.), *Юла* (п. Вялікі Мох Б-Каш.), *Уюн* (в. Конкавічы Петр.); **гаваркі:** *Балай* (в. Рагі Гом.), *Балабешка* (в. Чамярысы Браг.), *Балабон* (в. Ляхавічы Жытк.), *Балабуха* (в. Пірэвічы Жлоб.), *Балоба* (в. Вуглы Раг.), *Балтушка* (в. Шкураты Браг.), *Бараболіха* (в. Хальч Ветк.), *Бебко* (в. Давыдаўка Гом.), *Болбоцько* (в. Сямурадцы Жытк.), *Гаманіха* (в. Шкураты Браг.), *Гамоня* (в. Яроміна Гом.), *Лапатун* (в. Пакалюбічы Гом.), *Лапоцька* (в. Ціхінічы Раг.), *Лапоця* (в. Зялѐныя Лукі Гом.), *Мянташка* (в. Пірэвічы Жлоб.), *Перун* (в. Ліпляны Лельч.), *Сарока* (п. Глушыца Жлоб.), *Сініца* (в. Пярэдзелка Лоеўск.), *Тарапунька* (в. Чалюшчавічы Петр.), *Трандычыха* (п. Каравышань Гом.), *Трызор* (в. Званец Раг.), *Шабля* (в. Старое Сяло Ветк.), *Шчукар* (в. Слабада Б-Каш.), *Ямеля* (г. п. Капаткевічы Петр.); **ганарысты, самаўпэўнены, фанабэрысты:** *Барклай* (в. Азяраны Раг.), *Гусар* (в. Пярэдзелка Лоеўск.), *Гусь* (в. Дзімамеркі Лоеўск.), *Дваранін* (в. Картынічы Лельч.), *Задзірэй* (в. Рагі Гом.), *Карона* (г. п. Церахоўка Добр.), *Капітан* (в. Ястрабка Лоеўск.), *Мэр* (в. Баравікі Светл.), *Певень* (в. Алексічы Хойн.);

**гняўлівы, сварлівы:** *Байда* (в. Глушыца Жлоб.), *Бурбалка* (в. Ляхавічы Жытк.), *Гамус* (в. Майскае Жлоб.), *Макагон* (в. Кавалѐўка Раг.), *Лыч* (в. Чкалава Гом.), *Скаварада* (в. Чорнае Рэч.), *Чубка* (в. Старое Сяло Ветк.), *Цігра* (в. Радзеева Б-Каш.; в. Радуша Жлоб.);

**гультаяваты, гультай:** *Біндуль* (в. Ляхавічы Жытк.), *Біч* (в. Конкавічы Петр.), *Блында* (в. Радуга Ветк.), *Калодка* (в. Салтанаўка Жлоб.), *Лабад* (г. Тураў Жытк.), *Лажбень* (в. Кажушкі Хойн.), *Лежань* (в. Малыя Аўцюкі Калінк.), *Лут* (в. Лапаціна Гом.), *Луцік* (в. Шарпілаўка Гом.), *Лындзік* (в. Азяраны Раг.), *Лянчык* (в. Шарпілаўка Гом.);

**задзірысты, аматар пабіцца:** *Барэц* (г. п. Церахоўка Добр.), *Біюк*

(в. Кузьмінічы Добр.), *Боўдала* (в. Пірэвічы Жлоб.), *Буйнік* (в. Бяланавічы Петр.), *Буян* (в. Малыя Аўцюкі Калінк.), *Вайна* (в. Аціркі Петр.), *Вурка* (в. Маркавічы Гом.), *Драпец* (в. Залунеўе Б-Каш.), *Лаза* (в. Радуша Жлоб.), *Казѐл* (в. Рудня Целяшоўская Гом.), *Канаплюк* (в. Колкі Петр.), *Калчак* (в. Кашалѐва Б-Каш.), *Клюка* (в. Вуглы Раг.), *Коршак* (в. Колкі Петр.), *Мамай* (в. Станькаў Раг.), *Певень* (в. Краснаселле Хойн.), *Пятух* (в. Азершчына Рэч.);

**злы, злосны:** *Злыдзень* (п. Вялікі Мох Б-Каш.), *Клізма* (г. Жлобін), *Навальніца* (в. Маркавічы Гом.), *Перац* (в. Майскае Жлоб.), *Піраннял* (п. Красны Маяк Гом.), *Рог* (г. Рэчыца), *Рыська* (в. Ванюжычы Петр.), *Соля (Соль)* (в. Бяланавічы Петр.), *Сучка* (в. Кругавец Добр.), *Туча* (в. Церахоўка Добр.), *Храпа* (в. Малешаў Жытк.), *Хрэн* (в. Рудня Целяшоўсквя Гом.), *Цытра* (в. Уборкі Лоеўск.), *Шакал* (в. Бывалькі Лоеўск.), *Шмель* (в. Бабунічы Петр.);

**маўклівы:** *Воўк* (в. Праскурні Жлоб.), *Моўша* (в. Краснаселле Хойн.), *Рыбіна* (в. Уборак Лоеўск.);

**назойлівы, надакучлівы:** *Гастрыт* (в. Азершчына Рэч.), *Дапякучка* (в. Кароткавічы Жлоб.), *Жужка* (в. Бывалькі Лоеўск.), *Зык* (в. Рагі Гом.), *Камар* (в. Рудня Целяшоўская Гом.), *Клешч* (в. Залунеўе Б-Каш.), *Шашаль* ( в. Шкураты Браг.); **неахайны:** *Абезьяна* (в. Чорнае Рэч.), *Галапупенка* (в. Касцюкоўка Гом.), *Гламазда* (п. Усход* Б-Каш.), *Дзяружка* (п. Каравышань Гом.), *Дыдуха* (в. Церабееўка Рэч.), *Замарашка* (в. Рагі Гом.), *Кабыла* (в. Рэчкі* Ветк.), *Караўка* (в. Рэчкі* Ветк.), *Квашня* (в. Уборак Лоеўск.), *Кікімара* (в. Сямурадцы Жытк.), *Клуша* (в. Тонеж Лельч.), *Кнюх* (в. Саўхозная Б- Каш.), *Кулѐма* (в. Ліпнякі Лоеўск.), *Кура* (в. Ліпнякі Лоеўск.), *Лахудра* (г. Жлобін; в. Удалѐўка Лоеўск.), *Леля* (в. Пірэвічы Жлоб.), *Мазур* (г. п. Церахоўка Добр.), *Малпа* (в. Конкавічы Петр.), *Мурзілка* (в. Малінаўка Лоеўск.), *Растропа* (в. Церабаў Петр.), *Рэпанка* (в. Сямурадцы Жытк.), *Свіння* (в. Конкавічы Петр.), *Трыпузы* (в. Пірэвічы Жлоб.), *Хероня* (в. Уборак Лоеўск.), *Цюрыха* (в. Маркавічы Гом.), *Чупачка* ( в. Маркавічы Гом.), *Чухонка* (в. Зяткавічы Карм.); **нелюдзімы**: *Воўк* (в. Сямурадцы Жытк.), *Дзічка* (п. Вялікі Мох БКаш.), *Ёжык* (в. Рудня Целяшоўская Гом.), *Звярок* (п. Нагорная Гом.), *Капуста* (в. Шарпілаўка Гом.), *Тхор* (в. Вялікія Сялюцічы Петр.), *Тарзан* ( в. Станькаў Раг.);

**палахлівы, баязлівы:** *Верабей* (в. Алексічы Хойн.; в. Рудня Целяшоўская Гом.), *Заяц* (в. Леніна Добр.), *Трус* (в. Алексічы Хойн.),

*Капшук* (в. Колкі Петр.), *Суслік* (в. Аціркі Петр.); **песіміст, увесь час скардзіцца, жаліцца:** *Бурбалка* (в. Маркавічы Гом.), *Бядуха* (в. Вуглы Раг.), *Гаротнік* (п. Красны Маяк Гом.), *Журык* (в. Радуша Жлоб.), *Канька* (в. Елянец Б-Каш.), *Кароста* (в. Кавалёўка Раг.), *Кіслы* (в. Саўхозная Б-Каш.), *Няшчасніца* (в. Сямурадцы Жытк.), *Обіда* (в. Малешаў Жытк.), *Уксус* (в. Пірэвічы Жлоб.); **пітушчы, піток, злоўжывае спіртным:** *Барыла* (в. Дзімамеркі Лоеўск.), *Барбос* (п. Глушыца Жлоб.), *Бітон* (В. Пірэвічы Жлоб.), *Вінішча* (в. Уборак Лоеўск.), *Жлукта* (в. Церабееўка Рэч.), *Кабак* (п. Васільеўка Добр.), *Кампот* (в. Малінаўка Лоеўск.), *Кульдзюм* (г. п. Церахоўка Добр.), *Лізун* (в. Іванькаў Лоеўск.), *Магарыч* (в. Леніна Добр.), *Мутны* (в. Радуша Жлоб.), *Насос* (г. п. Церахоўка Добр.), *Стакан* (в. Іванькаў Лоеўск.), *Стаканчык* (в. Азершчына Рэч.), *Трубіла* (в. Завічча Светл.), *Цадзілка* (в. Малыя Аўцюкі Калінк.), *Цундрык* (в. Колкі Петр.), *Цэбар* (в. Сямурадцы Жытк.), *Чаркін* (в. Азяраны Раг.), *Шкалік* (в. Неглюбка Ветк.);

**плаксівы, шмат плача:** *Галасуха* (в. Зяткавічы Карм.), *Слёзка* (в. Астражанка Лельч.);

**пляткар**: *Аўчарка* (в. Дзімамеркі Лоеўск.), *Балаболка* (п. Усход* Ветк.), *Босы* (в. Кажушкі Хойн.), *Зрок* (в. Васількова Рэч.), *Путля* (в. Глушыца Жлоб.), *Сарока* (в. Шкураты Браг.), *Свіста* (в. Рагі Гом.), *Судак* (в. Давыдаўка Гом.), *Ціліўкала* (в. Кузьмінічы Добр.);

**працавіты, працалюбівы:** *Аганёк* (в. Стоўпня Раг.), *Буйвал* (в. Ціхінічы Раг.), *Бык* (в. Карпаўка Лоеўск.; в. Хальч Ветк.), *Жылін* (в. Ванюжычы Петр.), *Камета* (в. Маркавічы Гом.), *Кашэль* (в. Хальч Ветк.), *Мурашка* (в. Сямурадцы Жытк.), *Пчолка* (в. Хальч Ветк.), *Сундук* (в. Шарпілаўка Гом.), *Сяміжыльны* (в. Курганне Раг.), *Хвілінка* (в. Алексічы Хойн.); **сарамлівы**: *Бурачок* (в. Саўхозная Б-Каш.); **скупы, сквапны:**

*Базарнік* (г. Жыткавічы), *Беда* (в. Колкі Петр.), *Гнеда* (в. Церабееўка Рэч.), *Драла* (в. Новы Сцепаноў Браг.), *Жыд* (в. Маркавічы Гом.), *Канаплюк* (в. Колкі Петр.), *Коршак* (в. Рудня Целяшоўская гом.), *Кулак* (в. Свяцілавічы Ветк.), *Куркуль* (в. Азяраны Раг.; в. Сямурадцы Жытк.; г. п. Церахоўка Добр.), *Скапчыха* (п. Каравышань Гом.), *Сыч* (в. Кузьмінічы Добр.), *Фэбус* (в. Бабоўка Жлоб.), *Хамідла* (в. Саўгаснае Б-Каш.), *Хапка* (в. Кавалёўка Раг.), *Хова* (в. Красноўка Нараўл.);

**смелы:** *Чэпай* (в. Вароніна Жытк.); **спакойны**: *Рахманы* (в. Кажушкі Браг.), *Пуховы* (в. Малешаў Жытк.);

**сонны, санлівы, любіцель доўга паспаць:** *Пажарнік* (в. Касцюкоўка Гом.), *Храпа* (в. Малешаў Жытк.), *Храпела* (в. Асобіна Б-Каш.); **сэрцаед:** *Альфонс* (в. Хальч Ветк.), *Амур* (г. Жлобін), *Жарабец* (в. Рудня Целяшоўская Гом.), *Кошка* (в. Кашалѐва Б-Каш.), *Луіс* (в. Радуша Жлоб.), *Манах* (в. Леніна Добр.); **упарты**: *Баран* (в. Уборак Лоеўск,; в. Чорнае Рэч.), *Бык* (в. Яроміна Гом.), *Казѐл (Козѐл)* (в. Майскае Жлоб.; в. Сямурадцы Жытк.; в. Целяшы Гом.), *Убой* (в. Дзімамеркі Лоеўск.), *Чурбан* (в. Азяраны Раг.; в. Колкі Петр.);

**усюды ўлазіць, умешваецца**: *Калумб* (в. Дзімамеркі Лоеўск.), *Шыла* (в. Грохаў Лоеўск.); **хітры:** *Жук* (в. Давыдаўка Гом.), *Змей* (в. Дзімамеркі Лоеўск.), *Круцька* (в. Рудня Целяшоўская Гом.), *Ліс* (в. Буда-Люшаўская Лоеўск.), *Ліса* (в. Ціхінічы Раг.), *Лука* (п. Вялікі Мох Б-Каш.), *Лявіцкі* (в. Кажушкі Хойн.), *Мендаль* (в. Алексічы Хойн.); **хлуслівы:** *Брэхуль* (в. Клімаўка Гом.), *Соя* (в. Стоўпня Раг.); **ціхі, мірны:** *Голуб* (в. Лучын Раг.), *Марат Казей* (в. Ціхінічы Раг.), *Рахманы* (в. Кажушкі Хойн.), *Цюлень* (в. Рудня Целяшоўская Гом.);

**шкодлівы, шкоднік:** *Жыган* (в. Кузьмінічы Добр.), *Кот* ( в. Алексічы Хойн.), *Шчупак* (в. Азершчына Рэч.).

Багаты фактычны матэрыял сведчыць, што мянушкі, якія характарызуюць псіхічныя якасці асобы, складаюць значны пласт лексікі. Многія мянушкі ўтрымліваюць як прамую характарыстыку асобы, так і ўскосную. Некаторыя найменні сведчаць пра ўплыў на неафіцыйны імяннік літаратуры, фальклору, мультыплікацыйных і кінафільмаў. Гумар, народная дасціпнасць і назіральнасць носьбітаў гаворкі зʽяўляюцца рашаючымі фактарамі іх утварэння і ўжывання. Яны зʽяўляюцца натуральнымі прадуктамі жывога маўлення і на канкрэтных прыкладах дэманструюць шырокія словаўтваральныя магчымасці народнадыялектнай мовы.

**Літаратура**

1. Беларуская антрапанімія: вучэб. дапам. / Г. М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", 2009. – 254 с.
2. Усціновіч, А. К. Найменні асоб мужчынскага полу ў актавых запісах Гродзеншчыны і Брэстчыны XVI–XVII стст. / А. К. Усціновіч // З жыцця роднага слова. – Мінск, 1968. – С. 54.

**Спіс умоўных скарачэнняў (раѐнаў):**

Б-Каш. – Буда-Кашалѐўскі; Браг. – Брагінскі; Ветк. – Веткаўскі; Гом. – Гомельскі; Добр. – Добрушскі; Жлоб. – Жлобінскі; Жытк. – Жыткавіцкі; Калінк. – Калінкавіцкі; Карм. – Кармянскі; Лельч. – Лельчыцкі; Лоеўск. – Лоеўскі; Петр. – Петрыкаўскі; Раг. – Рагачоўскі; Рэч. – Рэчыцкі; Светл. – Светлагорскі; Хойн. – Хойніцкі.

* Страчаныя вѐскі.